АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА Ў РАЗМОВЕ ПАВІНШАВАЎ УЛАДЗІМІРА ПУЦІНА З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ

Адбылася тэлефонная размова прэзідэнтаў Беларусі і Расіі, у ходзе якой Аляксандр Лукашэнка павіншаваў свайго расійскага калегу Уладзіміра Пуціна з днём нараджэння і выказаў самыя цёплыя пажаданні. Аб гэтым паведамілі **БЕЛТА** ў прэс-службе беларускага лідара.

ДЗЯРЖАВА БУДЗЕ АКАЗВАЦЬ ПАДТРЫМКУ ПАРТЫЯМ ПАТРЫЯТЫЧНАЙ НАКІРАВАНАСЦІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць, што дзяржава павінна аказваць падтрымку партыям патрыятычнай накіраванасці. Такое меркаванне ён выказаў 8 кастрычніка на сустрэчы з другім сакратаром Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі Ігарам Карпенкам, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

«Давайце шчыра гаварыць: трэба іх падтрымаць. Мы не будзем утрымліваць, дапусцім, за кошт бюджэту, але падтрымку ім трэба аказаць. Таму што «пяцікалоннікі» атрымліваюць значныя ўліванні з-за мяжы, гэта немалыя грошы, прынамсі, на існаванне ім хапае. А партыі, якія нас падтрымліваюць, краіну падтрымліваюць, дзейнічаюць у інтарэсах народа, — у іх часам нават офіса няма, і будынка, і пакоя для таго, каб арганізаваць прыём людзей», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

І, нарэшце, мы і іх можам папрасіць, каб яны нам даводзілі інфармацыю з месцаў. Гэта не чужыя нашаму народу партыі, таму я не баюся гэтага і публічна гавару аб тым, што яны не павінны ледзь трымацца — партыі патрыятычнай накіраванасці, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Там, дзе яны патрэбны народу, па тых напрамках мы ім будзем дапамагаць».

У час сустрэчы абмеркаваны пытанні функцыянавання беларускіх партый і рухаў патрыятычнай накіраванасці, у прыватнасці Камуністычнай партыі Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка выказаў шкадаванне, што гэта партыя была некалі расколатай. «Але няма ліха без дабра і наадварот. Тая частка, якая адкалолася ад КПБ, ужо стала маргінальнай. Гэта партыя была патрыятычнай у цэлым, а частка, якая адкалолася, фактычна з'яўляецца авангардам усёй нашай «пятай калоны». Можа, і лепш. Няхай. Яны доўга да гэтага ішлі і нарэшце прыйшлі», — адзначыў Прэзідэнт.

«Кампартыя Беларусі засталася ўсё ж патрыятычнай партыяй, патрыятычнай накіраванасці», — дадаў ён.

Сярод іншых абмеркаваны таксама пытанні мінулай выбарчай кампаніі ў беларускі парламент, удзелу ў ёй партый патрыятычнай накіраванасці.

Што датычыцца Камуністычнай партыі Беларусі, то, як адзначыў Ігар Карпенка, перад партыяй стаяць новыя задачы па ўмацаванні партыйнай структуры, нарошчванні колькасці. Акрамя таго, трэба вырашыць шэраг пытанняў, вызначаных нядаўна прынятай новай рэдакцыяй праграмы Кампартыі Беларусі.

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ ПАВІНШАВАЎ ВІКТОРЫЮ АЗАРАНКА З ПЕРАМОГАЙ У АДКРЫТЫМ ЧЭМПІЯНАЦЕ КІТАЯ ПА ТЭНІСЕ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Вікторыю Азаранка з перамогай у адкрытым чэмпіянаце Кітая па тэнісе. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Васіль Жуковіч

ВІКТОРЫЯ АЗАРАНКА — АЗАРТ І ПЕРАМОГА

Вікторыя Азаранка,
Твой поспех — подзвіг твой.
Умелая, азартная,
Твой тэніс — харство!

Дух цвёрды стаўся фактарам
Удач у барацьбе.
Майстэрства і характару
Не пазычаць табе.

Гульнёй тваёй прыгожаю
І подзвігам такім
І Мінск наш заварожаны,
І сонечны Пекін!..

Азаранка Вікторыя,
Цябе шануе Бог.
Ты —ява і гісторыя
Бліскучых перамог.

■ Парламенцкі дзённік

СУРАГАТНЫЯ МАЦІ ЗМОГУЦЬ АТРЫМАЦЬ ДЗЯРЖАЎНУЮ ДАПАМОГУ

Учора на апошнім пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання дэпутаты ўхвалілі самыя галоўныя фінансавыя дакументы краіны на наступны год.

Размова пра абноўленыя Падатковы і Бюджэтны кодэкс і Закон «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2013 год», якія былі разгледжаны ў другім чытанні.

Змены ў падатковы кодэкс накіраваны на спрашчэнне падатковай сістэмы і зніжэнне падатковай нагрузкі, запэўніў калег **намеснік старшыні пастаяннай камісіі па бюджэце, фінансах і Падатковай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Мечыслаў КАСЦЮК.**

— За апошнія 6 гадоў у Беларусі адменена 26 падатковых плацяжоў, — нагадаў ён. — У аснову падатковай сістэмы нашай краіны пакладзены стандартны пералік падаткаў, якія прымяняюцца як у нашых партнёраў па Мытным саюзе, АЭП, так і ў іншых краінах. Да сусветных стандартаў прыведзена перыядычнасць выплаты падаткаў і падачы падатковай дэкларацыі — раз на квартал, у асобных выпадках — раз на год. Падатковы цяжар на эканоміку за апошнія 5 гадоў знізіўся на 8,3 %. Сёння ён параўнальны з узроўнем падатковага цяжару ў Расіі і Казахстане і дазваляе ў поўным аб'ёме фінансаваць дзяржаўныя выдаткі і забяспечыць канкурэнтаздольнасць нашай эканомікі ў АЭП.

Згодна з новым законапраектам, стаўкі асноўных падаткаў на наступны год захаваюцца. Разам з тым для арганізацый, якія выкарыстоўваюць спрошчаную сістэму падаткаабкладання, будуць зніжаны стаўкі падаткаў, павялічаны крытэрыі выручкі і колькасці работнікаў. Адначасова прадугледжваецца выплата падатку на нерухомасць пры плошчы аб'ектаў больш за 1,5 тысячы кв.м, падатку на зямлю пры плошчы ўчастка больш за 0,5 га.

Прадугледжана індэксацыя ставак падаткаў, вызначаных у беларускіх рублях, у межах параметраў інфляцыі 2012—2013 гадоў у сярэднім на 22%. Гэта закране стаўкі зямельнага, экалагічнага падатку, падатку на здабычу карысных выкапняў, адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў, фіксаваных ставак падаходнага падатку, падатку на ігральны бізнэс.

З наступнага года плануецца адмяніць ільготу па ПДВ на паслугі сувязі для фізічных асоб, а мясцовым Саветам даць права павялічваць да 5 разоў стаўкі падаткаў на нерухомасць па аб'ектах, якія не выкарыстоўваюцца альбо неэфектыўна выкарыстоўваюцца.

Гэтыя змены накіраваны на вырашэнне задачы радыкальнага спрашчэння падатковай сістэмы, лібералізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці, эканамічнага росту і прыцягнення інвестыцый у сацыяльную абарону грамадзян, запэўніў Мечыслаў Касцюк.

Змены ў Бюджэтны кодэкс датычацца ліміту доўгу органаў кіравання і самакіравання, механізму вяртання бюджэтных грошай і адзіных падыходаў у пытаннях кантролю за іх выкарыстаннем.

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі таксама прыняла ў другім чытанні законапраект «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2013 год». Праект рэспубліканскага бюджэту на наступны год сфарміраваны на бездэфіцытнай аснове. Агульная сума даходаў кансалідаванага бюджэту прагназуецца ў памеры Br197,41 трлн, або 31,3 працэнта ВУП. Даходы па праекце рэспубліканскага бюджэту прадугледжваюцца ў суме Br121,72 трлн, або з ростам да чаканага выканання 2012 года на 26,1 працэнта. Асноўныя крыніцы падатковых даходаў рэспубліканскага бюджэту — падатак на дабаўленую вартасць, акцызы, падатковыя даходы ад знешнеэканамічнай дзейнасці.

Выдаткі кансалідаванага бюджэту на 2013 год прагназуюцца ў суме Br197,41 трлн. Выдаткі па праекце рэспубліканскага бюджэту сфарміраваны ў суме Br121,72 трлн.

У 2013 годзе асноўныя мэты для сектара дзяржаўных фінансаў — павышэнне ўстойлівасці і канкурэнтаздольнасці нацыянальнай эканомікі, гарантаванае выкананне фінансавых абавязацельстваў бюджэту перад знешнімі і ўнутранымі крэдыторамі, а таксама захаванне якасці бюджэтных паслуг і сацыяльная абарона слаба абароненых катэгорый насельніцтва.

У наступным годзе захаваецца сацыяльная накіраванасць расходаў бюджэту. Значную частку ў іх складуць расходы на аплату працы, пенсіі, стыпендыі, дапамогі, іншыя выплаты, сродкі на выкананне дзяржаўных сацстандартаў. Прыярытэты бюджэтнай палітыкі: ахова здароўя, адукацыя і навукі.

Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь Міхаіл МЯСНІКОВІЧ ад імя ўрада падзякаваў дэпутатам за прыняцце бюджэту на 2013 год, зладжаную працу з урадам, канструктыўныя прапановы і падтрымку.

— Гэта бюджэт развіцця, — падкрэсліў ён. — У нас у эканоміцы дастаткова сіл не толькі для таго, каб забяспечваць устойлівы рост, але і паступальнае эканамічнае развіццё, якое гарантуе нармальную працу рэальнага сектара эканомікі, бюджэтнай сферы і павышэння заробкаў нашых грамадзян.

Яшчэ адным дакументам, які закране ў наступным годзе інтарэсы вялікай колькасці беларусаў, стаў праект новага закона «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей». Ён быў разгледжаны дэпутатамі ў першым чытанні.

— Перш за ўсё пашыраецца кола асоб, якія маюць права на атрыманне дапамог — тыя ж самыя бежанцы і людзі, якія пражываюць у нас часова, але працуюць і выплачваюць страхавыя ўнёскі, — пералічыла для журналістаў асноўныя змены ў законапраекце **міністр працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь Марыяна ШЧОТКІНА.** — Змяняецца падыход да памераў дапамог: да 3 гадоў дапамога будзе выплачвацца на першае дзіця 35% ад сярэдняга заробку за папярэдні квартал, на другое і кожнае наступнае дзіця — 40%. Дакладна агавораны, калі і якія будуць пераразлікі: як толькі статыстыка дае вынікі па сярэднім заробку.

Прапануецца спрасціць умовы па выплаце дапамог на дзяцей, якім больш за 3 гады і выраўнаваць умовы атрымання дапамогі па нараджэнні дзіцяці для ўсіх жанчын — незалежна ад таго, зарэгістраваны яе шлюб або не. Жанчыны, якія выхоўваць дзяцей самастойна, па дадатковую дапамогу будуць звяртацца ў мясцовыя органы ўлады. Законапраект прадугледжвае таксама выплату дапамог сурагатным маці, якія сталі на ўлік цяжарнасці да 12 тыдняў. Жанчынам, якія заключылі з імі дагавор, прадугледжана дапамога па нараджэнні дзіцяці.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■ Футбол

ЯК АДАБРАЦЬ МЯЧ У ІСПАНЦАЎ?

Падобнае пытанне хвалюе трэнераў літаральна кожнага сапернika пірэнейцаў. У тым ліку і беларусаў, якія 12 кастрычніка прымаюць славутых чэмпіёнаў свету і Еўропы на сталічным стадыёне «Дынама».



Шкада, у сёлетнім адборачным цыкле чэмпіянату свету-2014 дружына Георгія Кандрацьева вынікамі не зэзе, перамог пакуль не дасягае. Стартавыя паражэнні ад Грузіі, Францыі — і каманда ў аўтсайдарах групы І. Што казаць, адмоўныя паказчыкі напярэдадні сустрэчы са зборнай, якую лічаць лепшай на планеце, не радуюць. Але Георгій Кандрацьеў, галоўны трэнер зборнай Беларусі, аптымізму не губляе.

— Тых людзей, якіх я выклікаў у зборную, лічу зараз мацнейшымі ў Беларусі. Спадзяюся, яны дапамогуць вырашыць задачы, якія стаяць перад камандай. Калі кагосьці не выклікаў, дык толькі з-за траўмы, — падчас спецыяльнай прэс-канферэнцыі адказвае на пытанні журналістаў Георгій Пятровіч.

Нягледзячы на гэта, пытальнікаў у Кандрацьева не паменшылася. У нядзелю траўму атрымаў нападаючы ФК «Мінск» Леанід Ковель, і нацыянальная каманда засталася літаральна з адным форвардам. Як трэнерскі штаб збіраецца вырашаць форс-мажорную сітуацыю?

— Зараз у футболе цэнтральных нападаючых засталося няшмат. Каманды гуляюць групай атакі. А гэта і «Барселона», і «Рэал». Безумоўна, хочацца, каб у нас было больш нападаючых, але трэба выходзіць з таго, што ў нас ёсць. На жаль, траўму атрымаў Антон Пуціла. А ў мяне былі задумкі, звязаныя з ім. Давядзецца зноў думаць.

Акрамя таго, журналісты закранулі пытанне цудоўнага выступлення БАТЭ ў Лізе чэмпіёнаў. Як адзначыў Георгій Кандрацьеў, іх «перамогі — гэта вялікі плюс для беларускага футбола, для мяне як трэнера зборнай. І мяне ўсцешвае, што гульцы зборнай растуць у БАТЭ. Мяркую, псіхалагічна хлопцы будуць добра падрыхтаваныя. Бо гульня з Іспаніяй не менш важная, чым матч з «Баварыяй».

Дарэчы, зноў разам з галоўнай камандай краіны рыхтуецца Аляксандр Глеб. Але ёсць у зборнай і Рэнан Брэсан. Што цікава, убачыць гэтых футбалістаў БАТЭ адначасова на полі — з'ява рэдкая.

— З Сашам мы пастаянна кантактуем, — прызнаецца трэнер. — А што тычыцца ўзаемадзеяння Брэсана і Глеба, дык у першым матчы плэй-оф Лігі чэмпіёнаў супраць ізраільскага «Хапаэля» яны ўзаемадзейнічалі вельмі добра. Добрыя футбалісты заўжды знойдуць агульную мову на полі. Я не бачу ніякіх цяжкасцяў.

Што тычыцца Іспаніі, гэта каманда, гуляць на перамогу з якой неймаверна складана нават топавым зборным. І знайсці супрацьдзеянне да гульнявой манеры «чырвонай фурыі», як паказваюць апошнія буйныя старты, не здолеў пакуль ніхто. Кандрацьеў разважае, што ўявіць, як перамагчы іспанцаў можна, але ажыццявіць гэта значна складаней.

— Зборная Іспаніі — наймацнейшая каманда ў свеце. Перайграць яе вельмі цяжка, але мы паспрабуем.

Галоўная праблема ў гульні з Іспаніяй у тым, што яны мяч не аддаюць. У матчы з Грузіяй іспанцы па кантролі мяча мелі перавагу ў 80 на 20 працэнтаў. Яны проста адабралі мяч, і грузіны стаялі ўсёй камандай у абароне. А яшчэ праблема і ў тым, што, калі каманда мяч забярэ, дык яны ім зноў завалодаюць паблізу штрафной пляцоўкі. Мы паспрабуем яго не губляць, адсунуць гульню, аднак зрабіць гэта будзе складана. Калі, напрыклад, прайграем, аднак будзем гуляць у футбол, а не стаяць на месцы, чакаючы гол у свае вароты, тады, напэўна, балельшчыкі нам даруюць.

— Але ці могуць іспанцы недаацаніць беларусаў?

— Хочацца, каб недаацэнка была. Аднак такія прафесіяналы, напэўна, добра вывучаць нашы гульні і паставяцца да нас з павагай.

Дарэчы, пра балельшчыкаў. Цэны на квіткі гэтай сустрэчы зараз і сапраўды палохаюць. Што казаць, калі білеты каштуюць ад 210 да 360 тысяч беларускіх рублёў. І паверыць у аншлаг пакуль складана.

— Безумоўна, хацелася б, каб стадыён быў запоўнены. Але ад мяне гэта мала залежыць. Я прашу, каб балельшчыкі прыйшлі на стадыён і падтрымалі каманду.

Тарас ШЧЫРЫ

АБЗАЦ

◢ Выстава «Пакроўскі кірмаш» праходзіць у Мінску з 7 па 13 кастрычніка. Праваслаўны форум прымеркаваны да свята Пакрова Прасвятой Багародзіцы. На кірмаш з'ехаліся каля ста прадстаўнікоў манастыроў і храмаў, праваслаўных прыходаў, выдавецтваў і майстроў народнай творчасці з Беларусі, Расіі, Украіны.

◢ **У Капыльскім раёне дрэва, якое ўпала, смяротна траўмавала мужчыну. Трагедыя адбылася ў лясным масіве непадалёк ад в. Камсамольскае. Пры нарыхтоўцы драўніны на мужчыну 1971 г.н., жыхара в. Сунаі, упала дрэва. Пацярпелы быў тэрмінова шпіталізаваны, аднак пазней памёр у бальніцы.**

ПОЎНЫ АБЗАЦ

◢ У адным з прыватных дамоў у Краснаярскім краі аказаліся прапісанымі 1203 чалавекі. Дом плошчай усяго 35 квадратных метраў зусім трухлявы і непрыдатны для жылля. Гэты дом выяўлены праваахоўнікамі падчас маштабнай праверкі жыллёвага фонду краю, якая атрымала назву «Гумавыя хаты». У выніку выяўлена 115 жылых памяшканняў, дзе замежныя грамадзяне былі зарэгістраваны «ў неабмежаванай колькасці». Праблема стала магчымай з-за таго, што цяпер ні ў адным афіцыйным дакументе не вызначана мінімальная або максімальная велічыня жылой плошчы, на якую ўласнік можа зарэгістраваць іншых грамадзян.

◢ **Якіх толькі незвычайных конкурсаў прыгажосці не бывае! Нядаўна ў Кітаі прайшоў яшчэ адзін — «Міс Дойная карова». Конкурс прайшоў на адным з правінцыйных сельскагасадарчых кірмашоў. Рагулі спрачаліся за права называцца лепшай у такіх катэгорыях, як надоі малака, радаслоўная, знешні выгляд. А для «ажыўлення» мерапрыемства вырашылі запрасіць сімпатычных дзяўчат у бікіні. Менавіта гэта выклікала шырокі рэзананс сярод шматлікіх гледачоў. Некаторыя карыстальнікі інтэрнэту заявілі, што падобныя фота — гэта своеасаблівае «агра-порна». А лепшую карову выбіралі як эксперты, так і інтэрнэт-карыстальнікі. Гаспадар пераможцы атрымаў грашовую прэмію ў памеры 50 тыс. юаняў (US$7860). У конкурсе прыняло ўдзел каля 200 кароў.**

ТЕХНОБАНК

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2012 года

Наименование банка: **ОАО «Технобанк»** (в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	01.10.2012	01.10.2011
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		69 542,4	39 384,9
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		843,1	14,4
4	Средства в Национальном банке	1103		119 933,5	30 362,4
5	Средства в банках	1104		157 278,2	158 043,9
6	Ценные бумаги	1105		672,6	17 682,0
7	Кредиты клиентам	1106		568 902,9	334 871,7
8	Производные финансовые активы	1107		-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		52,1	66,5
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		169 310,3	76 214,5
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		6 418,3	17 859,2
12	Прочие активы	1111		78 922,8	47 289,6
13	**ИТОГО АКТИВЫ**	**11**		**1 171 876,2**	**721 789,1**
14	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
15	Средства Национального банка	1201		28,2	6 050,6
16	Средства банков	1202		119 455,7	60 426,9
17	Средства клиентов	1203		769 835,6	460 075,0
18	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		13 338,5	59 704,7
19	Производные финансовые обязательства	1205		151,0	-
20	Прочие обязательства	1206		12 380,8	10 524,9
21	**ВСЕГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**	**120**		**915 189,8**	**596 782,1**
22	**КАПИТАЛ**				
23	Уставный фонд	1211		57 347,4	46 586,9
24	Эмиссионный доход	1212		-	-
25	Резервный фонд	1213		7 171,0	7 171,0
26	Фонд переоценки статей баланса	1214		149 028,9	43 714,2
27	Накопленная прибыль	1215		43 139,1	27 534,9
28	**ВСЕГО КАПИТАЛ**	**121**		**256 686,4**	**125 007,0**
29	**ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ**	**12**		**1 171 876,2**	**721 789,1**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 октября 2012 года

Наименование банка: **ОАО «Технобанк»** (в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт пояснительной записки	01.10.2012	01.10.2011
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		81 107,9	31 542,4
2	Процентные расходы	2012		49 215,1	28 602,9
3	**Чистые процентные доходы**	**201**		**31 892,8**	**2 939,5**
4	Комиссионные доходы	2021		39 730,3	25 669,6
5	Комиссионные расходы	2022		7 600,1	7 214,3
6	**Чистые комиссионные доходы**	**202**		**32 130,2**	**18 455,3**
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		26,7	2,8
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		(2 462,6)	3 485,1
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		29 011,5	33 985,8
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		(398,9)	1 404,9
11	Чистые отчисления в резервы	207		525,4	15 340,4
12	Прочие доходы	208		72 908,3	13 586,0
13	Операционные расходы	209		116 033,9	38 772,9
14	Прочие расходы	210		7 065,2	2 884,3
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		39 483,5	16 861,8
16	Налог на прибыль	212		880,8	702,7
17	**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)**	**2**		**38 602,7**	**16 159,1**

И.о. Председателя Правления **Д.Ю. Грузицкий**

Главный бухгалтер **Н.А. Кузьмицкая**

03 октября 2012 года

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 11 от 31.05.2010 г.

ВЕСТЭРНІЗАЦЫЯ ЯК ВЫКЛІК

Вестэрнізацыя з'яўляецца адной з тых з'яў, якія наўпрост уплываюць у інтарэсах Захаду на жыццё ўсіх незаходніх краін, уключаючы Беларусь. Яна можа трактавацца як навязванне, прамое і спакваля, заходніх каштоўнасцяў, пунктаў гледжання, імкнення да высокіх стандартаў жыцця грамадзянам незаходніх краін.

Як адзначае аглядальнік «Нью-Ёрк Таймс» Т. Фрыдман, цяпер людзі не параўноўваюць сябе са сваімі бацькамі. Цяпер яны параўноўваюць сябе са сваімі суседзямі — усюды. Таму што яны могуць адсочваць іх па ўсім свеце пры дапамозе тэлебачання, спадарожнікавых антэн, DVD і інтэрнэту. Палярнае ўздзеянне вестэрнізацыі адзначае і вядомы даследчык Н. Фергюсан, сцвярджаючы, што ў выніку наступлення заходняй цывілізацыі на Блізкі Усход магчыма казаць пра яўны раскол блізкаўсходніх суполак на прыхільнікаў умеранай вестэрнізацыі і фундаменталістаў. Вестэрнізацыя стала самастойным праектам заваявання розумаў у краінах, размешчаных па-за заходнім арэалам, праз выкарыстанне апошніх тэхнічных дасягненняў у сферы ўплыву на паводзіны і псіхалогію індывіда. На думку Г.Г. Дзілігенскага, жыхары бедных краін і прадстаўнікі небагатых слаёў тым цяжэй перажываюць сваё становішча, чым лепш яны ўяўляюць сабе «багатае жыццё» іншых краін і сацыяльных груп, якую ім штодзённа паказваюць аўдыявізуальныя масмедыя.

Важнай часткай вестэрнізацыі з'яўляецца ажыццяўленне ўплыву праз дзейнасць СМІ і заходніх недзяржаўных арганізацый, у тым ліку праваабаронных. Яны часта даюць адкрыта прадузятую ацэнку падзей, што адбываюцца па-за заходнім светам. Прафесар Універсітэта Лувена Ж. Брыкман адзначае, што спрэчкі вакол правоў чалавека ў асноўным вядуцца вакол палітычных правоў і правоў асобы, у той час як іншыя правы — эканамічныя і сацыяльныя, якія таксама ўваходзяць ва ўніверсальную Дэкларацыю правоў чалавека, часта ігнаруюцца, Ён прапануе звярнуцца да думкі эканамістаў Жана Дрэза і Амарціі Сена: яны разлічылі, што Кітай і Індыя, якія знаходзіліся ў прыкладна аднолькавай «стартавай пазіцыі», выбралі розныя шляхі развіцця, і адрозненне сацыяльных сістэм гэтых дзвюх краін (ахова здароўя) абумоўлівае штогод гібель 3,9 млн чалавек індыйцаў, якіх можна было выратаваць. Гэта звязана з тым, што Індыя спрабуе цалкам імітаваць Захад і ў эканоміцы, і ў палітыцы, а Кітай запазычвае толькі тое, што яму выгадна.

Прыватным аспектам вестэрнізацыі з'яўляецца культурны ўплыў. Так, прадукцыя Галівуда садзейнічае таму, што ў краінах, размешчаных за тысячы кіламетраў ад ЗША, вырастаюць мільёны прыхільнікаў ЗША, якія імкнуцца выглядаць і дзейнічаць, як амерыканцы ў папулярных заходніх фільмах. Галівуд стаў важнай часткай soft power, або «мяккай сілы», ЗША. Сіметрычным адказам з'яўляюцца дзеянні ўрада Францыі па падтрымцы французскай мовы і забароне дамінавання замежнай медыя-прадукцыі ў культурным жыцці, уключаючы абмежаванні на паказ замежных фільмаў у кінатэатрах і напрамак адлічэнняў ад іх пракату на развіццё нацыянальнага кінематографа. Падобныя крокі зроблены і ў Іране. Асобныя мерапрыемствы рэалізуюцца і ў Беларусі, уключаючы павелічэнне вяшчання ў нацыянальным эфіры айчынных музычных твораў.

Вестэрнізацыя часам атаясамліваецца з амерыканізацыяй. Але на справе гэта не так. Вестэрнізацыя ўяўляе сабой сукупнасць праектаў заваявання розумаў грамадзян незаходніх краін, выхавання як паклоннікаў амерыканцаў, так і англафілаў, франкафілаў, германафілаў і іншых прыхільнікаў той або іншай заходняй краіны, з'яўляючыся па сваім ахопе больш старадаўнімі і шырэйшымі за сучасную амерыканізацыю. Аднак на сучасным этапе амерыканізацыя стала, без сумнення, дамінуючай сілай вестэрнізацыі, якая адказвае за яе поспехі і паражэнні.

Сутнасць амерыканізацыі — ператварэнне грамадзян іншых дзяржаў у ментальнае падабенства сярэдняга амерыканца, які захапляецца амерыканскай канстытуцыяй, амерыканскай сістэмай кіравання і амерыканскай культурай бігмака, пепсі-колы і Галівуда. Гібрыдная асоба, якая атрымліваецца ў выніку бесперашкоднай амерыканізацыі, за межамі ЗША безагаворачна верыць у святую місію ЗША па абароне правоў чалавека ва ўсім свеце, вітае адкрыццё амерыканскіх ваенных баз на тэрыторыі сваёй краіны, з зачараваннем чакае новых прэм'ер Галівуда, падтрымлівае нацыянальных чыноўнікаў, якія праводзяць палітыку ўступак любым патрабаванням ЗША. Таму што ЗША і чыноўнікі ЗША не могуць памыляцца па прычыне дасканаласці самых свабодных у свеце амерыканскай сістэмы і амерыканскай канстытуцыі.

Самая важная праблема вестэрнізацыі заключаецца ў навязванні людзям, якія вырашаюць надзённыя матэрыяльныя праблемы выжывання, нематэрыяльных каштоўнасна-нарматыўных узораў і калектывізму. Гутаркі пра абарону правоў гея, лесбіянак і транссэксуалаў як найважнейшай задачы палітычнага развіцця, якія напышліва вядуцца заходнімі прадстаўнікамі, выклікаюць у насельніцтва краін, якія развіваюцца, нервовы смех, паколькі самі заходнія краіны прыйшлі да гэтага этапу толькі ў апошнія дзесяцігоддзі, выйшаўшы на добры ўзровень «дзяржавы дабрабыту». У якасці найважнейшых задач краін, якія развіваюцца, стаяць электрыфікацыя, індустрыялізацыя, забеспячэнне насельніцтва чыстай пітной вадой (праблема, якую на гэты дзень не змог вырашыць нават Кітай з яго вялізнымі фінансавымі рэсурсамі), масавы ахоп даступнай урачэбнай дапамогай, развіццё сельскай гаспадаркі з тым, каб вырашыць праблемы смярцей ад голаду, неаказанай медыцынскай дапамогі, непаўнацэннага фізічнага і інтэлектуальнага развіцця ў выніку пастаяннага галадання — г. зн. тыя праблемы, якія заходнія краіны вырашалі ў асноўным у XIX — пачатку XX стагоддзя і вырашалі ў многім пры дапамозе развіцця матэрыяльных каштоўнасна-нарматыўных узораў, якія садзейнічалі жаданню творча і самааддана працаваць.

Настойлівае навязванне Захадам сваёй нематэрыяльнай сістэмы каштоўнасцяў прыводзіць да парушэння цэласнай карціны свету і свайго месца ў ім у грамадзян краін, якія развіваюцца: вырашаючы элементарныя задачы нематэрыяльнага выжывання, яны ў разгубленасці глядзяць на заходні свет Поршэ і Мерседэсаў, шыкоўных асабнякоў і працоўных месцаў, якія неверагодна высока аплачваюцца. Навязванне постматэрыяльнай заходняй індывідуалізацыі пазбаўляе дзяржавы, якія развіваюцца, такіх важных рэсурсаў развіцця, як калектывізм і салідарнасць, без якіх немагчымы быў бы ні японскі, ні кітайскі, ні тайваньскі эканамічны цуд.

Вынікам вестэрнізацыі з'яўляецца індывід з рванай свядомасцю, які нявутульна адчувае сябе ў тым цывілізавана-матэрыяльным кантэксце, які павінен з'яўляцца для яго натуральным. Яго неўсвядомленае абурэнне з гэтай нагоды можа быць умела накіравана зацікаўленымі палітычнымі акцёрамі па двух асноўных рэчышчах: супраць уласнага ўрада, які не здолеў забяспечыць узровень жыцця, як у Амерыцы і ў Еўропе, або супраць Захаду, у выніку эгаізму якога асноўныя матэрыяльныя і фінансавыя рэсурсы аказаліся сканцэнтраванымі ў руках «залатога мільярда». Першы кірунак азначае чараду рэвалюцый з прыходам да ўлады прадстаўнікоў самых экзатычных ідэалогій, другі — рост тэрарызму і палітычных альянсаў супраць дамінавання Захаду. Як адзначаў С. Ханцінгтан, Захад заваяваў свет не з-за перавагі сваіх ідэй, каштоўнасцяў або рэлігіі (у якую была схілена толькі невялікая колькасць прадстаўнікоў іншых цывілізацый), але хутчэй перавагай у прымяненні арганізаванага гвалту. Жыхары Захаду часта забываюць гэты факт, жыхары не-Захаду ніколі гэтага не забудуць.

Можна рэзюмаваць, што вестэрнізацыя, прапагандуючы недарэчныя ў культурна-гістарычным, сацыяльным і эканамічным плане каштоўнасці, не спрыяе пазітыўнаму развіццю эканомікі, якое можа быць дасягнута за кошт звычайна мадэрнізацыі, а выстройвае дадатковыя перашкоды на шляху паспяховай мадэрнізацыі. Такім чынам, барацьба з распаўсюджваннем працэсаў вестэрнізацыі з'яўляецца адной з асноўных задач незаходніх нацыянальных урадаў. Падтрымка традыцыйных каштоўнасцяў, заслон на шляху заходніх каштоўнасцяў, якія дэмаралізуюць насельніцтва, з'яўляюцца механізмамі самаабароны для незаходняй дзяржавы, якая прэтэндуе на паспяховае эканамічнае развіццё.

Сяргей КІЗІМА,
загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар палітычных навук.